# Ірына Альхоўка: «Я жанчына-мост»

***Партрэт.*** *Для Ірыны Альхоўкі гендарная роўнасць ёсць асабістай і прафесійнай справай, якой яна адданая. Праваабаронца з Беларусі была вымушаная пакінуць радзіму ў 2021 годзе, бо была прыцягнута да крымінальнай адказнасці за палітычную дзейнасць.*

Наша размова з Ірынай выпадкова выпадае на Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю гвалту ў дачыненні да жанчын: «Гэта дзень, калі я разважаю над тым, чаму я займаюся гэтай тэмай больш за 25 гадоў, куды я іду і ці змяніліся мае мэты», - кажа яна, і мне прыемна быць сведкай гэтых разважанняў. Ірына паведамляе, што гэтая дата 25 лістапада ў Беларусі праходзіла для яе больш інтэнсіўна, чым сёння, калі яна жыве ў выгнанні. Журналісткі і журналісты ўвесь час шукалі гераінь і герояў, статыстыку, дадзеныя для падрыхтоўкі публікацый на гэтую тэму - тэму, якая яшчэ маладая: Арганізацыя Аб'яднаных Нацый пачала глабальную кампанію «16 дзён актыўных дзеянняў супраць гендарнага гвалту» толькі ў 2008 годзе.

## Вялікая мэта: гендарная роўнасць

У Беларусі Ірына працавала на кіруючых пасадах у такіх арганізацыях, як Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын (БАМХЖ) і ў праграме па прадухіленні гандлю людзьмі «Ла Страда Беларусь». Затым яна стварыла ўласную няўрадавую арганізацыю «Гендарныя перспектывы». У выніку масавых дзяржаўных рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці арганізацыя была закрыта ўладамі ў 2021 годзе пасля 11 гадоў выдатнай працы. З-за крымінальнага пераследу за дзейнасць па абароне праў жанчын Ірына была вымушаная пакінуць краіну і зараз жыве ў эміграцыі. Яна лічыць за лепшае не гаварыць аб сваёй актуальнай дзейнасці.

Вымушаная эміграцыя дала Ірыне магчымасць дыстанцыявацца, замацавацца і ацаніць свае дасягненні: *«У штодзённай працы мы часта бяжым далей і чагосьці не заўважаем. Чым сталей я раблюся, тым важней для мяне бачыць, што ўжо адбылося, які шлях прайшлі я, мае каляжанкі і ўвесь жаночы рух Беларусі»*. Яе мэта выступаць за гендарную роўнасць не змянілася. Але яе падыход іншы - дадаліся новыя перспектывы і любоў да сябе стала для яе больш важнай. Зараз яна часцей нагадвае сабе, што робіць «дастаткова».

## Ад сацыялогіі да фемінізму

У 1996 годзе Ірына абараніла дыплом па сацыялогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Тэма яе дыпломнай працы была прысвечана гендарным аспектам гісторыі і змяшчала скандальнае ў той час слова «гендар». Ірына ўспамінае, што пры падрыхтоўцы працы ў бібліятэцы яна знайшла толькі адну адзіную крыніцу, дзе згадваецца гэтае слова. Слова «гендар» было чымсьці новым і мала звыклым – як для самой Ірыны, так і для яе экзаменатараў, таму Ірына тады вырашыла ў першую чаргу выкарыстоўваць больш звыклую лексіку і гаварыць пра «жаночы рух» ці «правы жанчын». Аднак гэта не дапамагло яе твору выйсці ў мэйнстрым – Ірына ўспамінае, што ў рэцэнзіі атрымала водгук аб «высокіх патрабаваннях і залішняй амбіцыйнасці» свайго твору.

У той час Ірына не называла сябе феміністкай. У яе асяроддзі не было іншых жанчын, якія ідэнтыфікавалі сябе так, і яна не хацела стаць «лёгкай мішэнню» для крытыкі. Яна распавядае мне пра вялікую жаночую канферэнцыю ў 2000-я гады, на якую сабраліся ўдзельніцы з Украіны, Малдовы, Беларусі і Расіі. Адна з выступоўніц выйшла на трыбуну і заявіла, што яна «не феміністка», бо ў яе «ёсць муж і дзеці». Ірына не магла зразумець, чаму жанчына, якая замужам і мае дзяцей, не можа быць феміністкай. Свой шлях да феміністычнай самаідэнтыфікацыі яна апісвае наступным чынам: *«Гэта адбылося, калі я зразумела, што я абараняю жанчын ад дыскрымінацыі і змагаюся за тое, каб іх лічылі чалавечымі істотамі. Так што, вядома, я феміністка!»*

**Хвала мужным папярэдніцам**

Для Ірыны важна цаніць працу папярэдніх пакаленняў савецкіх актывістак – тых, хто не называў сябе феміністкамі, але былі феміністкамі паводле сваіх каштоўнасцяў. Гэтыя жанчыны, часам пенсійнага веку, знайшлі ў сабе смеласць далучыцца да жаночага руху. Яны вывучалі ангельскую мову, ездзілі на канферэнцыі і шукалі крыніцы інфармацыі ў той час, калі не было ні інтэрнэту, ні дыпломаў па гендарных даследаваннях, ні перакладаў класікі фемінізму. Ірына падкрэслівае, што тады быць фэміністкай патрабавала значна больш мужнасці і шкадуе, што няма летапісу беларускага жаночага руху.

**Праца над законапраектам аб супрацьдзеянні хатняму гвалту**

Сёння ў беларускім актывізме хваліць досвед працы з прадстаўнікамі ўлады здаецца дзіўным, бо ў 2020 годзе гэтыя дзяржаўныя структуры распачалі новую хвалю жорсткіх рэпрэсій супраць усіх, хто ставіцца да іх крытычна. Саджаць і катаваць могуць не толькі за грамадска-палітычную дзейнасць, але і за «не той» колер шкарпэтак ці падабайку ў сацсетках. Сама Ірына цудам пазбегла такой долі. Таму яе станоўчая ацэнка працы дзяржаўных актараў выклікае асаблівае здзіўленне.

Па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў Ірына разам з іншымі прадстаўніцамі і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці (БАМХЖ, «Радзіслава» і іншыя) распрацоўвала ў 2018 годзе стратэгію законапраекта па барацьбе з хатнім гвалтам. Гэтая стратэгія прадугледжвала абавязковы ўдзел гвалтоўных злачынцаў у папраўчых праграмах, падтрымку пацярпелых, а таксама рэгуляванне адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за адпаведныя злачынствы. Гэта быў той рэдкі выпадак, калі каментарыі прадстаўнікоў няўрадавых арганізацый публікаваліся ў дзяржаўных газетах.

З сённяшняй перспектывы гэта выглядае абсалютна нерэальна – ці сапраўды прагрэсіўны закон быў ініцыяваны дзяржавай? Ці насамрэч праект прадугледжваў змены ў заканадаўстве з улікам пункта гледжання тых, хто перажыў гвалт? Неверагодна, але факт. Ініцыятыва стала вынікам сумесных намаганняў актывістак і актывістаў і арганізацый, прызнаецца Ірына. Але яна таксама падкрэслівае ключавую ролю дзяржавы: *«Я хадзіла ў міністэрства, размаўляла з чыноўнікамі і не шкадую аб гэтым»*.

Пра гэты досвед Ірына расказвае з сапраўдным захапленнем. Для яе гэта не мела ніякага дачынення да падтрымкі дзяржаўнага апарату, а гэта было магчымасцю прадстаўляць інтарэсы жанчын – напрыклад, карыстальніц нумару экстраннай сувязі яе арганізацыі – на рэальным і высокім узроўні. Аднак потым з доляй суму яна дадае: *«Цяпер шмат хто кажа, што дзяржава нам няўдзячная, што яна нас выкінула, прыгнятае. Гэта праўда.*

*Але з іншага боку, мы зрабілі шмат для таго, каб дзяржава належала нам, і я гэтым таксама ганаруся»*.

На жаль, гэта гісторыя не мела хэпі-энду – законапраект не быў прыняты. З аднаго боку, праз уплыў прарасейскіх патрыярхальных сілаў, а з другога – праз яго публічную крытыку з боку нелегітымнага прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

## Ці з'яўляюцца правы жанчын правамі чалавека?

Іншым кантэкстам, у якім Ірыне давялося весці інтэнсіўную асветніцкую працу, былі праваабарончыя арганізацыі, якія ў Беларусі традыцыйна прадстаўлены пераважна мужчынамі. Тэмай бурных дэбатаў было (і ў некаторай ступені да гэтага часу застаецца), ці з'яўляецца жаночая тэматыка часткай парадку дня ў галіне правоў чалавека – ці не. Нягледзячы на ўпэўненасць у гэтых дэбатах і свае пераканаўчыя аргументы, Ірына лічыць гэтыя размовы непрыемнымі. У рэшце рэшт, яна чакала разумення і падтрымкі ад сваіх калег па праваабарончай сферы, але замест гэтага ёй прыйшлося *«змагацца за месца пад сонцам і ў гэтым пытанні»* і пераконваць сваіх калег, што жанчына – гэта чалавечая істота с асабістымі правамі. Нягледзячы ні на што, Ірына працягвала сваю справу. Для яе гэта пытанне альянсаў – яна перакананая, што праваабаронцы не павінны быць падзеленыя, бо гэта супярэчыць самой філасофіі ўніверсальных правоў чалавека, якая вучыць нас, што розныя групы падвяргаюцца дыскрымінацыі па-рознаму і таму маюць патрэбу ў сваіх асаблівых правах. Тым не менш, Ірына чэрпае рашучасць з павольнай, але няўхільнай змены праваабарончага дыскурсу: *«Калі я далучылася да руху, ён не называўся фемінізмам ці правамі чалавека – гэта была сацыяльная праца»*.

## Як важна бачыць змены

Ірына бачыць гісторыю як спіраль, якая паўтараецца, і цяпер зноў «закручваецца» ў бок рэгрэсу, адкату. З аднаго боку, яна ўпэўненая, што беларуская грамадзянская супольнасць здолела *«выхаваць пакаленне людзей, якія думаюць інакш, якія бачаць у свабодзе вялікую каштоўнасць і жадаюць інтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую і сусветную супольнасць»*. На яе меркаванне, гэтыя людзі ўспрымаюць саму дыскрымінацыю ці адсутнасць талерантнасці як *«нейкую лухту»*. Яна адзначае, што ёсць і іншыя беларускі і беларусы, якія крытыкуюць так званую «гендарную ідэалогію» і сцвярджаюць, што яна разбурае сем'і, традыцыйныя каштоўнасці і мараль.

Для Ірыны важна даць людзям магчымасць змяніць свой погляд. Яна называе сябе «жанчына-мост», таму што не бачыць у адкрытых праціўніках фемінізму ворагаў і гатовая ўступаць з імі ў дыялог. Аднак яна таксама ўсталёўвае межы і, напрыклад, не мірыцца з тым, каб яе «таптапі нагамі» і абражалі ў прафесійнай дзейнасці: *«Я зноў і зноў нагадваю сабе пра гэта і абараняюся. Але ўвогуле я не лічу свет жорсткім. Мы змяняем яго сваім прыкладам, сабою ў якасці ўзору для пераймання, паказваючы іншым, як у ім жыць»*.

## Нешта вярнуць

Адной з яе апошніх ініцыятыў перад тым, як арганізацыя была вымушана закрыцца ў Беларусі, былі так званыя «Тата-школы» – праект, накіраваны на цысгендарных мужчын.

Нягледзячы на відавочныя цяжкасці зацікавіць мужчынскую аўдыторыю тэмамі гендарнай роўнасці і шырока распаўсюджанага мужчынскага гвалту ў сем'ях, Ірына знайшла натхненне і тут: *«Ёсць мужчыны, якія гатовыя змяніцца. Яны задумваюцца і ўрэшце разумеюць, што выраслі ў такім асяроддзі, дзе гвалт нармалізаваўся, менавіта ў іх уласнай сям'і»*.

Ірыну апошнім часам усё часцей пытаюць, як яна прыйшла да фемінізму, што яна назірала, у чым удзельнічала. Яна лічыць, што цяпер многія ў руху страцілі надзею на перамены. Таму для яе як ніколі важна матываваць жанчын не губляць веру ў сябе, у сваю справу і ў чалавецтва ўвогуле. Нядаўна яна пачула фразу: «У першай частцы жыцця ты вучышся, у другой частцы зарабляеш, у трэцяй вяртаеш». Яна згодна з гэтым і лічыць, што дасягнула таго моманту, калі для яе надышоў час нешта вярнуць.